ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

№ 23 (780) ● Пятніца, 19 чэрвеня 1970 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIII

## УЛЬС СЕСІІ

іхова здалі экзамен па сучаснай беларускай мове студэн- курса факультэта журналістыкі. Кожны другі тут атры- у. Задаволены застаўся выкладчык Аркадзь Іосіфавіч казамі Леаніда Віцітнева, Ірыны Іберавай, Наташы Самажневай, Віктара Аўчарэнкі і іншых, якія раней не вывучалі беларускую мову.

● Свой асноўны экзамен па дзяржаўнаму праву СССР першакурснікі юрыдычнага факультэта І. Ванагель, В. Журава, І. Красоўская, І. Калядка, В. Хораў, Н. Астроўская і іншыя здалі дацэнту Анатолю Аляксандравічу Галаўко на выдатна.

● У гэту сесію поспех спадарожнічае студэнтам трэцяга курса гістарычнага факультэта. 24 чалавекі здаюць экзамены толькі на пяцёркі. Сярод іх А. Краўчанка, С. Нічыпарук, З. Шыбека, А. Мядзельцаў і іншыя. А выпускнікам гэтага факультэта Тані Глушаковай, Лене Баранавай, Пятру Шупляку, Валі Чыж, Олі Лапцевай і Алегу Кузняцову вучоны Савет вынес рашэнне ўручыць дыпломы выдатнікаў.

● Пяцікурснікі матэматычнага факультэта абараняюць зараз свае дыпломныя работы. Вось вынікі дзевятай групы. З 11 дыпламантаў 9 абараніліся на выдатна. Гэта Л. Забела, В. Гарохавік, С. Втарыгіна, М. Дзеравенскі, А. Калінін, С. Савельзон, С. Шэрман, Е. Барбашына і В. Лахаданаў. Лепшыя з гэтых работ рэкамендаваны да друку. Старшыня камісіі прафесар Ф. Л. Кірылава горача павіншавала выпускнікоў з паспяховым заканчэннем універсітэта, пажадала ім поспехаў у працы і ў асабістым жыцці.

На здымках: (уверсе) прафесар Алена Паўлаўна Кесарава прымае ў трэцякурснікаў біяфака экзамен па фізіялогіі чалавека і жывёл. Адказвае Галіна Шылахвост.

Паспяхова завяршыўся і гэты экзамен для абітурыента гістарычнага аддзялення завочнага факультэта маёра С. П. Зайцава. Экзаменатары К. Р. Аперанка і Л. Ф. Лабунова ацанілі яго веды па англійскай мове на добра.

Фота Д. Чаховіча.





## БЫВАЙ, УНІВЕРСІТЭТ!

Да дзяржаўнага экзамена па гісторыі КПСС студэнты VI курса вячэрняга аддзялення гістфака рыхтаваліся доўга і напружана. Яшчэ б, здаваць жа трэба было па новай праграме, вывучыць шмат фактычнага матэрыялу, пямала першакрыніц. І перад гэтым апошнім экзаменам хваляванне было не менш, чым перад самым першым.

І вось вынік. З шаснаццаці студэнтаў першай групы чацвёра атрымалі пяцёркі, восем — добрыя адзнакі, веды чатырох прызнаны камісіяй здавальняючымі.

Дацэнт З. Р. Грыгор'ева, якая прымала экзамен, адзначыла добрую падрыхтоўку студэнтаў, аднак падкрэсліла, што трэба больш уважліва вывучаць работы У. І. Леніна і лепш ведаць фактычны матэрыял. Тады не будзе такіх адзнак, як тройка.

Член дзяржаўнай камісіі дэкан факультэта П. З. Савачкін сказаў, што ён вельмі задаволен ведамі студэнтаў, асабліва такіх, як В. Курносава, А. Высоцкі, В. Кароткая, Т. Зубовіч, Д. Гафіятуліна, Л. Кавалёва, А. Зуеў і іншыя.

Вось і скончана вучоба. А зараз кожны з выпускнікоў пойдзе сваёй дарогай: хто выкладаць у школе, хто ў навуковыя ўстановы, іншыя ж застануцца на ранейшым месцы работы.

Бывай, родны універсітэт, дзе мы шэсць гадоў вывучалі шмат навук. Мы цябе ніколі не забудзем!

**М. ВЯРШЫНІН,**
выпускнік гістфака.

## ПРАПАГАНДЫСТЫ ПАДВОДЗЯЦЬ ВЫНІКІ

Закончыўся вучэбны год у сістэме палітасветы. Кіраўнікі семінараў, прапагандысты падводзяць рахункі вялікай працы, улічваюць недахопы ў планах на наступны год.

Асаблівую стабільнасць набыла праца ў філасофскіх семінарах універсітэта. Характэрнымі для гэтага года былі ленінская тэматыка, павышаная цікавасць да заняткаў і разам з гэтым устойлівае іх наведванне. Семінары праводзіліся на высокім навуковым узроўні і з'явіліся сур'ёзнай школай не толькі паглыблення тэарэтычных ведаў, але і распрацоўкі новых праблем. Гэтым адзначаецца семінар прафесарска - выкладчыцкага саставу матэматычнага, хімічнага, фізічнага факультэтаў, дзе кіраўніком прафесар В. І. Сцяпанаў.

Актыўна праходзілі заняткі ў калектыве вучэбна-вытворчых майстэрняў універсітэта. За год было праведзена 17 заняткаў, якія ахопліваюць шырокае кола палітычных пытанняў. Тут пры абмеркаванні на паліт-занятках Пісьма ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ аб эканоміі і беражлівасці выступаючымі было прапанавана упарадкаваць расход каштоўных каляровых металаў і пластмас, а таксама вырашана выкарыстоўваць другасны матэрыял для вытворчасці прасцейшых прыбораў. Толькі за тры месяцы гэта дало універсітэту каля 500 рублёў эканоміі.

Не менш цікава і карысна праходзілі заняткі на філалагічным, біялагічным, факультэце журналістыкі і іншых.

**А. СЛУКА.**

## НА БРАСЛАЎСКІЯ АЗЁРЫ

*Кожны год геаграфічны факультэт прадстаўляе на агляд студэнцкія навуковыя работы, якія атрымліваюць высокія адзнакі. Гэта вынік настойлівай працы маладых даследчыкаў не толькі на працягу вучэбных семестраў, але і ў час летняй практыкі.*

*Вось і сёлета адна з груп будучых географаў пад кіраўніцтвам старшага інжынера лабараторыі азёразнаўства Ірыны Аляксандраўны Мыслівец адпраўляецца на Браслаўскія азёры.*

*У час летняй практыкі студэнты другога, трэцяга, чацвёртага курсаў будуць вывучаць азёрныя глыбіні, састаўляць іх карты, праводзіць даследаванні рэк, ручаёў, што ўпадаюць у азёры, раслінасць і жывёльны свет вадаёмаў.*

*Усе даныя даследаванняў будуць апрацаваны ў лабараторыі азёразнаўства і выкарыстаны для навуковых работ.*

*І. СЕМІНА.*

## АБ ВЕДАХ СВЕДЧАЦЬ ЭКЗАМЕНЫ

Як і ў мінулыя гады, на фізічным факультэце летняя залікова-экзаменацыйная сесія асабліва цяжкая. Па-першае, таму, што ў гэты час студэнты II—IV курсаў здаюць многа залікаў і экзаменаў, па-другое, усе яны выконваюць курсавыя работы. Аднак, нягледзячы на гэта, экзаменацыйная сесія пачалася своечасова і арганізавана. Да 3 чэрвеня асноўная маса студэнтаў здала ўсе залікі па лабараторных, практычных і семінарскіх занятках. 283 студэнты пятага курса да гэтага часу здалі дзяржаўныя экзамены па марксісцка-ленінскай філасофіі. Прыемна адзначыць, што пераважная большасць іх атрымала выдатныя і добрыя адзнакі.

Першыя экзамены сведчаць, што да іх студэнты падрыхтаваліся добра: яны паказваюць глыбокія і трывалыя веды. Так, напрыклад, у трэцяй групе чацвёртага курса 10 студэнтаў з 23 атрымалі выдатныя адзнакі па навуковаму камунізму, а на экзамене па спецпрадмету пяцёркі атрымалі 19 чалавек, астатнія паказалі добрыя веды. Без троек вытрымалі экзамен і студэнты дзевятай групы гэтага ж курса.

Добра падрыхтаваліся да сесіі студэнты трэцяга курса Я. Белагорцаў, П. Кухарчык, В. Бязрукаў, чацвёртага курса А. Мінько, Ю. Макараў, А. Лопараў, М. Вішнеўскі і многія іншыя.

Студэнты-радыёфізікі пятага курса прыступілі да абароны дыпломных работ. 80 працэнтаў выпускнікоў вытрымалі гэты адказны экзамен паспяхова. Выдатна атрымалі В. Нясцюк, І. Пятровіч, А. Пятроў і іншыя.

Аднак частка студэнтаў фізічнага факультэта недастаткова працавала над вывучэннем праграмнага матэрыялу на працягу семестра і да экзаменацыйнай сесіі падрыхтавалася нездавальняюча. Да іх адносяцца А. Мішкарудны, С. Цішкевіч, А. Радзюк, В. Петачэнка, М. Злынаў, В. Скрабін, І. Мартынаў, Г. Рабцэвіч, В. Аўдзейчык, В. Грозны і іншыя. Гэтыя студэнты на працягу семестра прапусцілі больш 25 працэнтаў усіх заняткаў. Іх, відаць, мала цікавяць глыбокія веды па сваёй спецыяльнасці, і займаюцца яны па прынцыпу «абы здаць».

У паспяховасці сярод вучэбных груп ёсць вялікі разрыў. Адны вытрымліваюць экзамены на добра і выдатна, і здавальняючыя адзнакі тут паяўляюцца рэдка, другія паспяваюць ледзь-ледзь на здавальняюча і даюць вялікі працэнт адсеву. Да такіх слабых груп адносяцца чацвёртая, дзевятая і дванаццатая першага курса, адзінаццатая і пятнаццатая другога курса і некаторыя іншыя.

Многае ў паспяховасці залежыць ад калектыву групы. Там, дзе студэнты дружныя, згуртаваныя, пануе рабочая атмасфера, і лянівыя стараюцца працаваць і засвойваюць матэрыял даволі паспяхова. Праграма на фізічным факультэце разлічана не на якіх-небудзь фенаменаў, а на працаўнікоў, і ўсе, хто з самага пачатку вучобы ўзяў за аснову працу, на працягу ўсіх пяці год паспяваюць на добра і выдатна. Прыкладам можа служыць вучоба студэнтаў, якія паступаюць ва універсітэт з перыферыйных школ. Падрыхтоўка ў гэтых школах слабейшая, а выпускнікі вучацца значна лепш, чым паступіўшыя з мінскіх школ.

Лепшыя вынікі ў гэтую сесію паказваюць студэнты чацвёртага курса.

Мне здаецца, што летняя сесія пройдзе больш паспяхова, чым зімовая.

**Я. ПІСКУНОЎ.**

# ПОСПЕХ У БУДУЧЫМ—СЁННЯШНІ КАОПАТ

**На мінулым тыдні ва універсітэце адбыўся партыйна-гаспадарчы актыў, прысвечаны падрыхтоўцы да новага навучальнага года. Сёння мы прапануем чытачам матэрыялы з даклада прарэктара універсітэта А. Я. Малышава і выступленняў удзельнікаў актыву.**

***

Пачатак 1970-71 навучальнага года супадае са святкаваннем 50-годдзя камсамола Беларусі і падрыхтоўкай да 50-годдзя з дня адкрыцця нашага універсітэта. Усё гэта абавязвае калектыў універсітэта, кожнага асобнага работніка з выключнай адказнасцю і падвоенай энергіяй весці падрыхтоўку да новага навучальнага года.

Асноўныя задачы і напрамкі дзейнасці калектыву універсітэта ў новым навучальным годзе заключаюцца ў наступным:

— забяспечыць далейшае разгортванне работы па павышэнню ўзроўню і якасці падрыхтоўкі кадраў ва універсітэце. Для гэтага неабходна абагульняць накоплены вопыт і смела ўкараняць у практыку больш эфектыўныя формы і метады навучальнага працэсу;

— павышаць узровень палітыка-выхаваўчай работы сярод студэнтаў з мэтай іх усебаковага і гарманічнага развіцця;

— больш настойліва і сістэматычна прыцягваць навуковых работнікаў і студэнтаў да актыўнай грамадска-палітычнай работы з мэтай больш эфектыўнага выканання гаспадарча-палітычных задач і актывізацыі саміх студэнтаў у ажыццяўленні рашэнняў XVI з'езда ВЛКСМ;

— забяспечыць пашырэнне праблематыкі і павышэнне эфектыўнасці навуковых даследаванняў, укараненне дасягненняў навукі ў народную гаспадарку, далучаць усіх выкладчыкаў і супрацоўнікаў лабараторый да навукова-даследчай работы; пачынаючы з першага курса, прыцягваць студэнтаў да даследаванняў у навуковых лабараторыях;

— распрацаваць і здзяйсняць меры па павышэнню навуковай кваліфікацыі выкладчыцкага саставу, падрыхтоўкі і абароны імі кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый;

— весці больш настойлівую работу па ўмацаванню вучэбна-матэрыяльнай базы універсітэта, забеспячэнню навучальнага працэсу на усіх факультэтах навейшым абсталяваннем і тэхнічнымі сродкамі, забяспечыць найбольш эфектыўнае выкарыстанне прыбораў, машын і іншых тэхнічных сродкаў у навукова-даследчых лабараторыях і кабінетах;

— забяспечыць далейшае павышэнне ўзроўню арганізацыйнай работы на усіх участках дзейнасці універсітэта і павышэнне асабістай адказнасці кожнага без выключэння работніка універсітэта за даручаны яму участак работы, на якім бы пасту ён ні знаходзіўся.

Павінен адзначыць, што кіраўніцтва і партыйная арганізацыя універсітэта ужо даўно намецілі рад мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да новага навучальнага года і забяспечылі выкананне многіх вялікіх капітальных работ. Так, толькі за апошнія дзесяць месяцаў ва універсітэце уведзен у строй хімічны лабараторны корпус, занава капітальна адрамантаваны будынкі старога фізічнага, былых хімічнага і біялагічнага карпусоў. Адрамантаваны студэнцкія інтэрнаты № 4 і № 3, у якіх значна палепшаны жыллёва-бытавыя умовы студэнтаў: абсталяваны пакой быту, буфеты, пункты пракату, цырульні, атэлье па пашыву і рамонту адзення і абутку, душавыя і інш. Многае зроблена ў інтэрнатах № 1 і № 3, але наперадзе яшчэ працаёмкі рамонт інтэрнатаў №№ 2, 5, 6. Акрамя таго, адной з асноўных задач на бліжэйшыя 1,5—2 месяцы з'яўляецца сур'ёзны рамонт галоўнага корпуса універсітэта.

Акрамя рамонту памяшканняў, пры падрыхтоўцы да новага навучальнага года перад гаспадарчай часткай стаіць яшчэ вялікая работа па набыццю неабходнай мэблі, абсталявання лекцыйных аўдыторый і лабараторый.

Магу з задавальненнем адзначыць, што гаспадарчая частка універсітэта да гэтай пары паспяхова спраўлялася з арганізацыяй капітальных рамонтных работ у сціслыя тэрміны і пры высокай якасці.

Аднак у рабоце гаспадарчай часткі ёсць і шэраг сур'ёзных недахопаў. Асноўны з іх—недастатковая ініцыятыва некаторых работнікаў. Мы маем права прад'явіць сур'ёзныя прэтэнзіі да работы інжынера па рамонту В. А. Харэвіча, па віне якога на працягу года не наладжан знадворны паветравод у радыёхімічнай лабараторыі. Па яго віне не прыведзена ў бяспечны стан дрэваапрацоўчае абсталяванне у сталярным цэху. Мы прад'яўляем сур'ёзныя прэтэнзіі і да работы галоўнага энергетыка А. П. Смірнова, па віне якога не выконваюцца пагадненні па ахове працы: не закончана пераабсталяванне электрашчытавой у інтэрнаце № 4, у лабараторыях галоўнага і фізічнага карпусоў.

Маецца цэлы рад недахопаў у ахове працы: з-за адсутнасці спецыяльных складаў для захавання кіслот, метанолу і лёгкаўспламяняльных рэчываў на радзе кафедр і у лабараторыях дапускаецца захаванне павышанай колькасці гэтых рэчываў. Загадчык шклодуўнай майстэрні хімічнага факультэта Л. К. Канцавы сістэматычна парушае правілы пажарнай бяспекі ў рабоце з газавым абсталяваннем. Загадчыкі кафедр фізічнага факультэта А. М. Саржэўскі, А. Н. Пісарэўскі, В. В. Ізох допускаюць эксплуатацыю незаземленага электраабсталявання напружаннем звыш 1000 вольт.

Стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы патрабуе вялікіх капітальных укладанняў. Задача заключаецца ў тым, каб гэтыя укладанні былі выкарыстаны найбольш разумна і эканомна, з максімальным вынікам і выйгрышам часу. Аднак і ў гэтым пытанні не усё ва універсітэце здавальняюча. На радзе кафедр абсталяванне і прыборы набываюцца без уліку патрэбнасці ў іх, у выніку чаго лабараторныя памяшканні некаторых кафедр пераўтвораны ў сапраўдныя склады. Цяпер ва універсітэце накапілася невыкарыстоўваемага абсталявання на суму 126.809 руб. 94 кап. Пара загадчыкам кафедр перагледзець усё абсталяванне, якое ёсць на кафедрах, спісаць непатрэбнае, перадаць ва ўстаноўленым парадку годнае да выкарыстання ў іншыя вышэйшыя навучальныя ўстановы або школы, разгрузіць памяшканні і выкарыстаць іх для аўдыторных заняткаў. У рашэнні гэтага пытання актыўную і прынцыповую пазіцыю павінны заняць дэканы факультэтаў. Мы лічылі б мэтазгодным прыцягнуць да гэтай работы і камісіі народнага кантролю факультэтаў.

Важна ў летнія месяцы добра падрыхтаваць вучэбныя памяшканні і інтэрнаты да новага навучальнага года. Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на забеспячэнне аўдыторый якаснымі дошкамі, настольнымі кафедрамі, на рамонт вокан, дзвярэй, мэблі, выключальнікаў, на забеспячэнне належнага асвятлення ў аўдыторыях і г. д. На жаль, кожны год гэтыя дробныя недаробкі застаюцца і перашкаджаюць нашай нармальнай рабоце.

Рыхтуючыся да новага навучальнага года, калектыву універсітэта неабходна таксама многа зрабіць і для абнаўлення і удасканалення сваёй вучэбна-лабараторнай базы, за што ў першую чаргу павінны адказваць загадчыкі кафедр і дэканы факультэтаў. Іх адпачынак можа быць спакойным, калі яны забяспечаць рашэнне усіх гэтых задач.

Вялікая работа прадстаіць бібліятэцы універсітэта, асабліва па падбору вучэбнай літаратуры па дысцыплінах, набыццю нехапаючай літаратуры па заяўках кафедр. Бібліятэцы універсітэта неабходна да пачатку навучальнага года праверыць кабінеты усіх кафедр і вызваліць іх ад лішняй і устарэлай літаратуры.

Вялікае значэнне для пад'ёму ўзроўню падрыхтоўкі і выхавання высокакваліфікаваных спецыялістаў мае правільны адбор новага папаўнення студэнтаў. Універсітэт штогод папаўняецца здольнай, таленавітай моладдзю. У той жа час сацыяльны састаў нашага студэнцтва павінен рэзка паляпшацца і найбольш поўна адлюстроўваць сацыяльную структуру савецкага грамадства. За апошнія два гады ва універсітэт прынята звыш 50 працэнтаў рабочых і калгаснікаў. Задача заключаецца ў тым, каб і ў далейшым паляпшаць сацыяльны састаў студэнтаў. Для гэтай мэты ва універсітэце адкрыты завочныя курсы для падрыхтоўкі сельскай моладзі да паступлення ва універсітэт. Праведзена вялікая растлумачальная работа сярод сельскай моладзі аб спецыяльнасцях універсітэта, умовах прыёму, аб прыёмных экзаменах. Нашы вучоныя прынялі актыўны ўдзел у правядзенні алімпіяд, у злётах выпускнікоў сярэдніх школ у многіх раёнах Мінскай вобласці. Але гэтую работу нельга аслабляць. Добрая арганізатарская дзейнасць прыёмнай камісіі, правядзенне кансультацый для абітурыентаў, павышэнне адказнасці экзаменатараў за аб'ектыўнасць ацэнкі — вось што павінна стаць прадметам асаблівых клопатаў калектыву універсітэта ў бліжэйшыя дні.

З 1969 года ва універсітэце працуе падрыхтоўчае аддзяленне, у задачы якога уваходзіць забеспячэнне найбольш дабратворных умоў для атрымання ведаў, неабходных для паступлення ва універсітэт рабочай і калгаснай моладзі. У мінулым годзе былі недахопы па прыцягненню рабочай моладзі на падрыхтоўчае аддзяленне. Так, напрыклад, з 50 слухачоў, прынятых на дзённае навучанне, толькі 9 з сельскай мясцовасці. Відаць, нельга дапускаць такога становішча ў сёлетнім годзе.

Добра падрыхтавацца да новага навучальнага года — гэта значыць забяспечыць з першых дзён рытмічны ход навучальнага працэсу. Першай і асноўнай умовай добрай падрыхтоўкі да новага навучальнага года з'яўляецца падбор і правільная расстаноўка прафесарска-выкладчыцкіх кадраў.

На 1970-71 навучальны год, зыходзячы з вучэбнай нагрузкі, вызначан штат прафесарска - выкладчыцкага персаналу ў колькасці 1.104 адзінак. Неабходна сур'ёзна падысці да укамплектавання штатаў прафесарска-выкладчыцкага персаналу і асаблівую ўвагу звярнуць на далучэнне да штатнай работы ва універсітэце кадраў вышэйшай кваліфікацыі. Пакуль мала увагі падбору кадраў удзяляецца на фізічным, біялагічным і матэматычным факультэтах. Тут стала правілам прыцягваць значную колькасць сумяшчальнікаў і пачасавікоў. Рад сумяшчальнікаў далучаецца да работы без дастатковых падстаў, запланаваныя ім першапачатковыя аб'ёмы работ на працягу вучэбнага года скарачаюцца.

Многія недахопы ў навучальным працэсе знаходзяцца ў прамой залежнасці ад узроўню метадычнай работы. Справа ў тым, што за апошнія гады значна узрасла колькасць выкладчыцкага саставу. Так, напрыклад, за апошнія 5 год на педагагічную работу прыняты 382 маладыя работнікі, што складае каля 40 працэнтаў ад агульнай колькасці выкладчыкаў універсітэта. Зразумела, што моладзь, якая прыйшла на выкладчыцкую работу, не валодае дастатковымі уменнямі і навыкамі. Таму ў планы работы кафедр і індывідуальныя планы выкладчыкаў павінны быць уключаны такія пытанні, як арганізацыя навучальнага працэсу: распрацоўка і карэкціроўка рабочых планаў, работа па састаўленню рабочых праграм, устанаўленне агульных прынцыпаў і метадаў планавання аўдыторных заняткаў і самастойнай работы студэнтаў, вызначэнне сістэмы кантролю за вучобай студэнтаў, распрацоўка рэкамендацый па методыцы правядзення аўдыторных заняткаў і самастойнай работы, прымяненне тэхнічных сродкаў і метадаў праграміраванага навучання, распрацоўка планаў вучэбнай і вытворчай практыкі, выданне вучэбна-метадычных дапаможнікаў, рэгулярнае абмеркаванне лекцый, узаеманаведванне і г. д. Усё гэта трэба зрабіць цяпер, да канца бягучага навучальнага года, сур'ёзна абмеркаваўшы гэтыя планы на кафедрах, каб вучоныя усіх катэгорый рыхтавалі сябе да іх выканання ў новым навучальным годзе.

Да пачатку навучальнага года неабходна занава перагледзець праграмы спецкурсаў і прадставіць іх на зацвярджэнне праз вучэбны аддзел рэктару універсітэта.

Загадчыкам кафедр і дэканам факультэтаў неабходна закончыць састаўленне вучэбных даручэнняў выкладчыкам на 1970-71 навучальны год да іх водпуску. Планы работы кафедр трэба старанна адпрацаваць і прадставіць на зацвярджэнне да 20 верасня 1970 года.

Дэканы факультэтаў павінны саставіць стабільныя расклады вучэбных заняткаў да 1 ліпеня 1970 года, прычым ніякім чынам не перадаверяючы гэтую даволі адказную справу сакратарам факультэтаў.

Новы навучальны год павінен стаць годам далейшага удасканалення камуністычнага выхавання студэнцкай моладзі. На кожным факультэце трэба распрацаваць канкрэтныя планы выхаваўчай работы на аснове нашага перспектыўнага плана на ўвесь перыяд навучання, сумесна з грамадскімі арганізацыямі замацаваць выкладчыкаў за студэнцкімі групамі. Распрацоўка планаў выхаваўчай работы на факультэтах павінна быць завершана да пачатку навучальнага года.

Далейшага пад'ёму павінна дасягнуць навукова-даследчая работа ва універсітэце. Неабходна дабівацца, каб навукова-даследчыя лабараторыі, вылічальны цэнтр больш эфектыўна выкарыстоўваліся для далейшага пад'ёму тэарэтычнага узроўню выкладання, дапамагалі выхоўваць у студэнтаў зацікаўленасць да навукі, творчыя адносіны да справы, прывівалі ім даследчыя навыкі.

Аднак недастаткова распрацаваць планы, прыняць новыя абавязацельствы, трэба забяспечыць паўсядзённы кантроль за іх выкананнем, дабівацца таго, каб кожны пункт плана быў ажыццёўлен.

У другой палове чэрвеня месяца неабходна правесці пасяджэнні саветаў факультэтаў, на якіх абмеркаваць пытанне аб падрыхтоўцы да новага навучальнага года, вельмі патрабавальна, вельмі крытычна аднесціся да работы кожнай кафедры, кожнага падраздзялення, кожнага работніка.

Яшчэ адна вялікая задача — арганізавана і на належным узроўні правесці летнюю лабараторна-экзаменацыйную сесію са студэнтамі-завочнікамі. Ці усё зроблена кафедрамі для паспяховага правядзення экзаменацыйнай сесіі на завочным факультэце? На жаль, не.

Многія кафедры універсітэта па-ранейшаму дрэнна кантралююць якасць вучэбных заняткаў, не праводзяць наведвання і узаеманаведвання выкладчыкамі заняткаў, не абмяркоўваюць тэматычныя планы лекцый і практычных заняткаў. Амаль на усіх курсах аддзялення правазнаўства сесія ужо закончана. Але ні адзін загадчык кафедры не наведаў заняткі сваіх выкладчыкаў.

Вучоны савет універсітэта абавязаў усіх выкладчыкаў у час экзаменаў праводзіць субяседаванне па кантрольных работах. Але многія выкладчыкі гэтага не робяць. Асобныя кафедры юрыдычнага, гістарычнага і філалагічнага факультэтаў нясвоечасова складаюць тэматыку кантрольных і курсавых работ.

Да гэтай пары студэнты-завочнікі дрэнна забяспечваюцца падручнікамі і вучэбнымі праграмамі. Дрэнныя справы з напісаннем вучэбна-метадычных дапаможнікаў для завочнікаў. Практычна кафедры універсітэта гэтым пытаннем не займаюцца.

Варта зрабіць сур'ёзны папрок бібліятэцы універсітэта, якая недастаткова забяспечвае студэнтаў-завочнікаў вучэбнай літаратурай.

Загадчыкам кафедр трэба звярнуць самую сур'ёзную увагу на работу кабінетаў. Праверкай устаноўлена, што многія з іх у час сесіі не працуюць.

Сур'ёзныя прэтэнзіі трэба прад'явіць кафедрам матэматычнага факультэта. Нягледзячы на сур'ёзныя папярэджанні, усе віды вучэбнай работы са студэнтамі-завочнікамі праводзяць толькі асістэнты, якія не маюць дастатковага вопыту работы ў вну.

Несумненна, парткому універсітэта, партарганізацыям факультэтаў трэба накіраваць сваю увагу на рашэнне усіх пералічаных задач.

Мы перакананы, што ў новым навучальным годзе работнікі універсітэта з гонарам выканаюць стаячыя перад імі задачы. Яны прыкладуць усе сілы да таго, каб дастойна сустрэць 50-гадовы юбілей БДУ, падняць навукова-выхаваўчую і навукова-даследчую работу на новы, больш высокі узровень, які адпавядае задачам камуністычнага будаўніцтва.

***

Выступаючы ў спрэчках, загадчык вытворчай практыкі **У. Д. Мухаеў** адзначыў, што патрэбнасць у палявых базах практыкі—1500 месц, а ёсць у наяўнасці толькі адна — на возеры Нарач, на 400—500 месц. Такім чынам, забяспечанасць палявымі базамі складае усяго 30 працэнтаў. Даўно ужо біёлагі і географы праводзяць практыку ў п. Першамайскім і ля Гарадка. За гэты час тут можна было б пабудаваць стацыянарныя базы без вялікіх затрат, выкарыстоўваючы дамы, што зносяць у Мінску. Аднак два гады рэктарат марна чакае ад савета біяфака і геафака абгрунтавання неабходнасці і месца палявых баз.

У. Д. Мухаеў звяртае увагу удзельнікаў партыйна-гаспадарчага актыву на недахопы ў арганізацыі вучэбна-палявой практыкі студэнтаў другога курса геафака стацыянара і студэнтаў-біёлагаў і географаў вячэрняга аддзялення і завочнага факультэта.

— З году ў год не выконваецца вучэбны план па практыцы на хімічным факультэце, — гаворыць тав. Мухаеў. — Дэканат не вырашае пытанні методыкі практыкі, не мае праграм.

Дырэктар выдавецтва БДУ **Л. А. Севасцьянчык** расказала аб тым, што робіцца калектывам выдавецтва па падрыхтоўцы да новага навучальнага года. Рыхтуецца да выпуску шэраг падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, асобных манаграфій. Выйшла ўжо «Зарубежная літаратура», на гэтых днях будзе гатоў тыраж кнігі «Пытанні навуковага камунізма», рыхтуюцца да выдання «Лекцыі па гісторыі КПСС», завяршаецца работа над такімі кнігамі, як «Курс лекцый па палітэканоміі сацыялізма», «Асновы навуковага атэізму», «Курс лекцый па педагогіцы», «Уводзіны ў кібернетыку». Цяпер мы завяршаем складанне плана выпуску літаратуры ў 1971 годзе. Аднак работа ідзе з цяжкасцямі. Мала прапанаваных да выпуску работ па хіміі, фізіцы, біялогіі, няма ні адной работы па беларускай літаратуры. Асаблівай размовы патрабуе пытанне аб навуковых зборніках.

Л. А. Севасцьянчык гаворыць далей аб неабходнасці паляпшэння ўмоў працы работнікаў выдавецтва.

Студэнт гістфака **Руновіч** расказаў аб недахопах у арганізацыі быту студэнтаў, якія жывуць у інтэрнатах, зрабіў заўвагі аб якасці рамонту, абсталяванні пакояў, парадку дзяжурства студэнтаў і г. д.

У сваім выступленні рэктар універсітэта акадэмік **А. Н. Сеўчанка** спыніўся на пытаннях выхаваўчай работы, забяспечанасці студэнтаў інтэрнатамі, гаварыў аб тых недахопах, якія трэба неадкладна выкараніць.

У спрэчках прынялі таксама ўдзел прафесар **Ф. Д. Гахаў**, дацэнт **Н. П. Хрыпко**, прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце **І. А. Ожыгін**, намеснік дэкана хімічнага факультэта **Г. А. Браніцкі** і іншыя.

У пастанове вылучаны першачарговыя задачы, ад аператыўнага вырашэння якіх залежаць арганізаванасць, зладжанасць у рабоце ў новым навучальным годзе.

РАСКАЗВАЕМ ПРА НАШЫ ФАКУЛЬТЭТЫ

# БУДНІ ПАДРЫХТОЎЧАГА

## ІНТЭРВ'Ю ДАЕ У. Н. СТРЭЛЬЧАНКА, НАМЕСНІК ДЭКАНА

**— З якой мэтай і калі быу створан падрыхтоучы факультэт!**

— У кастрычніку 1961 года. Такія ж факультэты існуюць у вну многіх іншых гарадоу, напрыклад, у Маскве, Ленінградзе, Кіеве. Яны створаны для таго, каб дапамагчы развіваючымся краінам у падрыхтоуцы нацыянальных кадрау. Мэта нашага факультэта — падрыхтаваць іншаземцау да вучобы у вну. Як правіла, да нас прыязджаюць студэнты, якія зусім не валодаюць рускай мовай. Разам з вывучэннем рускай мовы яны паутараюць асноуны курс навук.

**— Як вядзецца навучанне на факультэце!**

— Мы маем тры кафедры: рускай мовы, прыродазнаучых і грамадскіх дысцыплін. Студэнты разбіваюцца на патокі па 12 — 14 чалавек, а для вывучэння рускай мовы — на групы па 6—7 чалавек. Заняткі праводзяцца у добра абсталяваных кабінетах кваліфікаванымі выкладчыкамі. За год студэнты авалодваюць рускай мовай настолькі, што могуць слухаць лекцыі, весці канспекты.

**— Ці знаёмяцца навучэнцы падрыхтоучага факультэта з гісторыяй Мінска, з жыццём савецкіх людзей!**

— Вядома. Студэнтам чытаецца спецыяльны курс «Савецкі Саюз». Ён уключае у сябе лекцыі па гісторыі сацыялістычнай рэвалюцыі у нашай краіне, Айчыннай вайны, Беларусі і Мінска. Акрамя гэтага, праводзяцца экскурсіі на фабрыкі і заводы, сустрэчы з перадавікамі вытворчасці, з лепшымі вучонымі рэспублікі.

**— Як выкарыстоуваюць студэнты вольны час!**

— Любяць гуляць у валейбол, баскетбол, удзельнічаюць у мастацкай самадзейнасці, глядзяць кінафільмы, знаёмяцца з жыццём горада.

У час летняга адпачынку арганізоуваецца аутапоезд «Дружба» па гарадах Беларусі. Кожны год наладжваюцца экскурсіі у Брэсцкую крэпасць. У гэтым годзе такая экскурсія аказала вялікае уражанне на студэнтаў. Часта многія з іх праводзяць свой адпачынак на Мінскім моры.

## У ЦЕСНЫМ СЯБРОЎСТВЕ

Наш універсітэт адносіцца да ліку вну краіны, дзе разам з савецкімі студэнтамі вучацца юнакі і дзяучаты з розных краін свету. Сёння у нашым дружным студэнцкім калектыве жывуць прадстаунікі 21 краіны Еуропы, Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі — 336 замежных студэнтау. 188 з іх вучацца на асноуных факультэтах: фізічным, матэматычным, хімічным, біялагічным, юрыдычным і філалагічным. Але сёння размова пра наш падрыхтоўчы факультэт, поспехі якога неаднаразова адзначаліся міністэрствамі вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і БССР. Створаны дзевяць год назад, сёння ён налічвае ужо сотні выпускнікоу. Сёлета яшчэ 148 яго выхаванцау стануць студэнтамі вну і тэхнікумау нашай краіны.

Усю асноуную педагагічна-выхаваучую работу на факультэце вядзе педагагічны калектыу. Але гэтая важная справа не праходзіць і міма камсамольскай арганізацыі універсітэта. Самы цесны і непасрэдны кантакт існуе паміж студэнтамі падрыхтоучага факультэта і яго камсамольскай арганізацыяй. І хоць яна тут невялікая, але у яе актыве можна назваць рад значных і цікавых спрау, сярод якіх асаблівае месца займае правядзенне Ленінскага заліку. І таму не выпадкова у гонар ленінскага юбілею усе камсамольцы падрыхтоучага факультэта адзначаны камітэтам камсамола універсітэта.

Добрае слова падзякі можна сказаць і інтэрнацыянальнаму студсавету, якім кіруе В. Сярга. Рэгулярны выпуск насценнай газеты «Дружба», радыёгазеты, афармленне цікавых тэматычных стэндау і выставак надае інтэрнату не толькі прывабны выгляд, але і ствapae добры настрой для работы.

Па праву ганарыцца падрыхтоўчы факультэт сваёй мастацкай самадзейнасцю, якой кіруе А. У. Саннікава. Хочацца пажадаць гэтаму дружнаму калектыву яшчэ большых поспехаў у іх важнай працы.

**В. КУШНЕР,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола БДУ па інтэрнацыянальнай рабоце.**



## ВЫВУЧАЮЧЫ МОВУ ІЛЬІЧА

Словы У. Маякоускага «Я русский бы выучил только за то, что им разговаривал Ленин» можна лічыць дэвізам кожнага студэнта падрыхтоўчага факультэта. З вялікай цікавасцю і стараннасцю вывучаюць яны рускую мову. Кіруе гэтай вучобай кафедра рускай мовы, якую узначальвае Таіса Паулаўна Плешчанка. Мы сустрэліся з ёй якраз у той час, калі заняткі ужо скончыліся і ў вучэбным корпусе усталявалася цішыня.

Стомленая пасля працоунага дня, яна прыкметна ажыўляецца, калі гаворка заходзіць аб яе рабоце.

— Прыязджаюць да нас юнакі і дзяучаты, якія зусім не ведаюць рускай мовы. А працуем мы без перакладчыкаў, таму часта бывае вельмі цяжка.

Пачынаецца работа з алфавіта, пастаноукі гукау. На першае месца ставіцца лексіка бытавога характару, потым — па чарчэнню, матэматыцы, фізіцы. Для глыбейшага вывучэння мовы праводзяцца гутаркі па тэкстах, экскурсіі у музеі, да помнікаў, на прадпрыемствы.

Выкладчыкамі кафедры падрыхтаван і выдадзен зборнік «Героі Беларусі». Тэксты, змешчаныя у ім, дапамагаюць не толькі вывучаць мову, але і знаёмяць з гісторыяй Беларусі.

З другога семестра студэнтау рыхтуюць да канспектавання, вядзецца работа з газетай.

На факультэце есць свой радыёвузел. Перадачы рыхтуюць студэнты разам з выкладчыкамі. У іх, як і у газеце «Дружба», асвятляецца рознабаковае жыццё нашых в'етнамскіх сяброу.

Кожны выкладчык кафедры з'яуляецца адначасова і выхавацелем. Многіх з іх студэнты называюць «рускай мамай», пішуць аб іх сваім блізкім на радзіму.

Мы ўвесь час памятаем, што нашы навучэнцы жывуць далёка ад дому і стараемся акружыць іх увагай, дапамагчы ва усім.

## У СПРАВАХ МАЦНЕЕ ДРУЖБА

**У вучэбным корпусе падрыхтоучага факультэта пакуль што цішыня. Але вось раздаецца званок, і калідор напауняецца гоманам і вясёлым смехам.**

**Мы чакаем прэзідэнта в'етнамскага зямляцтва Чан Ван Чыонга. Ён абяцау расказаць аб жыцці сваіх суайчыннікау у Савецкім Саюзе, аб іх уражаннях.**

**Потым мы сядзім у свабоднай аудыторыі і Чыонг расказвае:**

**— Мы перапоунены пачуццём гордасці і радасці за тое, што жывём і вучымся у Савецкім Саюзе, на Радзіме Вялікага Леніна. Ужо з першых дзён знаходжання ў СССР мы рыхтаваліся да дастойнай сустрэчы ленінскага юбілею. Каб з гонарам адзначыць вялікую дату, мы паспяхова здалі Ленінскі залік, развучылі новыя песні аб Леніне. Кожны з нас напісау сачыненне «Ленін у маім жыцці», якое адлюстравала пачуццё удзячнасці і бясконцай любві да Ільіча. Але галоунае, чым мы сустрэлі ленінскі юбілей, — нашы лоспехі ў вучобе.**

**Мы жывём далёка ад радзімы, але адчуваем сябе як дома са сваімі роднымі, таму што выкладчыкі і студэнты клапоцяцца аб нас, дапамагаюць у любую цяжкую хвіліну. Нашым родным хочацца ведаць больш аб Савецкай краіне. І у пісьмах на радзіму мы расказваем аб гераічным савецкім народзе, аб яго поспехах. І тут мы не сумуем, бо побач з намі нашы рускія сябры.**

**У тым, што в'етнамскія і рускія студэнты сталі добрымі сябрамі, мы упэуніліся і тады, калі пабывалі у чыстых, светлых пакоях інтэрната, калі гутарылі са старшынёй студэнцкага савета Валянцінам Сяргой.**

**Студэнцкі савет інтэрнацыянальны. Сюды ўваходзяць 11 в'етнамскіх і 11 савецкіх рабят. На пасяджэннях разглядаюцца пытанні аб чысціні, аб узнагародах лепшага пакоя. Савет таксама арганізоувае вечары адпачынку, лекцыі аб В'етнаме і аб нашай краіне. Савецкія рабяты дапамагаюць в'етнамцам лепш авалодаць мовай. Яны расказалі нам аб здзіуляючай працаздольнасці в'етнамскіх студэнтау. А наогул яны такія ж, як і усе: любяць футбол, хакей, з задавальненнем глядзяць тэлевізійныя перадачы.**

Аб гераічным подзвігу Брэсцкай крэпасці расказвае яе абаронца Цімафей Пятровіч **Дамброўскі.**

Фота **М.** Нечыпарэнкі



## «ГАВОРЫМ, СПЯВАЕМ ПА-РУСКУ»

Часта пасля заняткау за дзвярыма аудыторый чуецца песня. Тонкі дзявочы голас старанна выводзіць: «Широка страна моя родная»... Гэта ідзе рэпетыцыя гуртка мастацкай самадзейнасці, якім кіруе выкладчык Ала Уладзіміраўна Саннікава. Развучваюць новую песню — і Ала Уладзіміраўна расказвае змест, яе гісторыю. І цяпер ужо самі рабяты шукаюць ноты, матэрыялы аб песнях.

Да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна харавы гурток падрыхтаваў праграму, якая складаецца з песень аб Леніне, пра Мінск і песень першых пяцігодак. А у рэпертуары танцавальнага гуртка — народныя в'етнамскія танцы і танцы Беларусі. Аудыторыя гледачоў у гуртко́ўцаў самая розная: таварышы па факультэту, студэнты політэхнічнага інстытута, рабочыя камвольнага камбіната, калгаснікі.

Сёлета на сустрэчы са студэнтамі у горадзе-героі Брэсце ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці выступілі з канцэртам. Асабліва цёпла прымалі слухачы песню «З чаго пачынаецца Радзіма?» у выкананні Чан Ань Міня. Вельмі спадабаўся і дуэт Фам Хонг Дзьеп і Ву Тхі Бін, які выканаў песню «Івушка».

І як бы завяршэннем вялікай работы гуртка з'яуляецца вечар «Гаворым, спяваем па-руску». Ён адбываецца кожнай вясной, калі надыходзіць пара развітання з факультэтам.

**Матэрыялы старонкі падрыхтаваны студэнтамі І курса факультэта журналістыкі А. ЛАМЕКА і Л. ПЕРАСЫПКІНАЙ.**

